# Віртуальная экскурсія «Зямля бацькоў – мая зямля»

**Х. В. Лазар,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
другой кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ № 4 імя П. І. Батава г. Слоніма
**С. Я. Маркевіч,**
настаўнік музыкі першай кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ № 4 імя П. І. Батава г. Слоніма

**Мэта**: выхаванне патрыёта і грамадзяніна.

**Задачы:**

- выклікаць у вучняў цікавасць да мінулага роднай краіны;
- актуалізаваць веды вучняў пра Беларусь, яе знакамітыя мясціны, знакамітых землякоў;
- садзейнічаць выхаванню пачуцця любові да сваёй Радзімы, павагі да яе гісторыі.

**Падрыхтоўчая работа:** вывучэнне вучнямі верша «Спадчына» на памяць, падрыхтоўка неабходнай інфармацыі да выступленняў.

Праводзяць мерапрыемства настаўнік беларускай мовы і літаратуры і настаўнік музыкі.

## Ход мерапрыемства

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

**Настаўнік музыкі.** Добры дзень, дзеці, сёння мы здзейснім віртуальную экскурсію па знакамітых мясцінах нашага старажытнага горада, а пачнём нашу вандроўку вось з гэтай прыгожай пабудовы. *(Фота сучаснага драматычнага тэатра горада Слоніма. Гучыць Паланэз Агінскага.)* Дзеці, вы ведаеце гэты твор? Якім чынам ён звязаны з нашым тэатрам? (*Адказы вучняў.*) Як вы лічыце, аб чым сёння пойдзе гаворка? Так, сёння мы пагаво-

рым пра наш родны край, яго мінулае, тую спадчыну, якую пакінулі нам нашы продкі.

**II. Інфармацыйна-дзейнасны этап**

**Вучаніца** *(распавядае пра росквіт горада Слоніма пад кіраўніцтвам Міхала Казіміра Агінскага).* Гісторыя Слоніма, аднаго са старажытнейшых гарадоў Беларусі, неразрыўна звязана з магнацкім родам Агінскіх. Асабліва з двума з іх – Міхалам Казімірам і яго пляменнікам Міхалам Клеафасам, аўтарам знакамітага паланэза «Развітанне з Радзімай». Росквіт Слоніма ў другой палове XVIII стагоддзя звязаны з дзейнасцю вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага, кампазітара, паэта і мецэната. Па яго ініцыятыве і на яго сродкі быў створаны канал, які злучыў Балтыйскае мора з Чорным. У Слоніме ён пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, тыпаграфію, а таксама заснаваў тэатр, слава пра які грымела па ўсёй Еўропе. Многія польскія, італьянскія, нямецкія оперныя і драматычныя акцёры лічылі за гонар служыць у ім. Музыку і тэксты для спектаклей часта пісаў сам Міхал Казімір Агінскі. Вялікая сцэна была створана для самых складаных тэатральных, оперных і балетных пастановак, конных баталій і водных феерый. Да нашых дзён захавала сваю першапачатковую назву вуліца Оперная, а кожны дзень апоўдні ў цэнтры горада чуюцца гукі вядомага паланэза, як успамін аб мінулым нашай Радзімы.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры.** М. К. Агінскі разам са сваім пляменнікам пакінулі нам найбагацейшы скарб, спадчыну, якая прайшла праз многія стагоддзі і да гэтага часу, не згубіўшы сваёй актуальнасці, адклікаецца ў кожным сэрцы. І спадчына гэта будзе жыць і далей, дзякуючы нам з вамі. Дзеці, а што такое спадчына? Тлумачальны слоўнік дае нам такое азначэнне? А што такое спадчына для вас? (*На дошцы складаецца асацыятыўны радок.*) Слова *спадчына* вядома нам і дзякуючы творчасці Янкі Купалы. Мы з вамі ўжо вывучалі верш «Спадчына». Зараз нам адновіць у памяці яго змест адзін з вучняў. (*Чытанне верша вучнем на памяць.*)

**Настаўнік музыкі.** Дзеці, а ці можам мы назваць гэты прыгожы верш Янкі Купалы і ўвогуле яго творы скарбам нашай зямлі? Чаму? Многія выдатныя творы нашых паэтаў і пісьменнікаў былі пакладзены на музыку і вось зараз я прапаную вам адчуць сябе сапраўднымі кампазітарамі і спрагназаваць, як бы гучала на ваш погляд песня «Спадчына»? Уявіце сабе ў якім тэмпе, гучнасці, характары мелодыі, настроі яна б гучала? (*Настаўнік запісвае на дошцы адказы вучняў.*). А зараз паслухаем песню «Спадчына» на музыку выдатнейшага беларускага кампазітара Ігара Лучанка, які, на жаль, пайшоў ад нас ў 2018 годзе, але пакінуў пасля сябе вялікую скарбонку найцудоўнейшых песень аб Беларусі. Гэта такія, як «Мой родны кут», «Алеся», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Бярозка» і іншыя. *(Гучыць песня.)* Якія ўражанні выклікаў у вас гэты твор? Якія думкі, настрой? Параўнайце сваю мадэль твора і задумку аўтара. Як музыка паўплывала на тэкст верша? Ці можам мы лічыць гэты твор скарбам нашай беларускай зямлі?

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры.** Мы працягваем нашу вандроўку па родным краі. Звярніце ўвагу на дошку: ці знаёмыя вам гэтыя мясціны: Петралевічская гара, помнік ва ўрочышчы Маргі, помнік на чапялёўскіх палях, Вечны агонь? Гэтыя мясціны – таксама наша спадчына, трагічная спадчына. Ёсць у гісторыі нашага краю страшныя, жудасныя старонкі. І гэтыя помнікі – напамін нам пра несуцешны боль. Вялікая Айчынная вайна пакінула на нашай краіне вялікі адбітак, які заўсёды будзе напамінам для нас пра подзвіг беларускага народа, пра яго найвялікшыя страты.

**Вучань** *(расказвае пра Слонімшчыну ў гады Вялікай Айчыннай вайны).* Слонімшчына панесла вялікія страты ў гады ваеннага ліхалецця – 44418 сланімчан загінулі. Прах 5223 воінаў і 108 партызан пакоіцца на Слонімскай зямлі. На Пятралевічскай гары было расстраляна больш за 10 тысяч чалавек, на чапялёўскіх палях – 30 тысяч, ва ўрочышчы Маргі – 2 тысячы. 10 ліпеня 1944 года савецкія войскі вызвалілі горад ад нямецкіх захопнікаў. На тэрыторыі раёна знаходдзіцца 86 помнікаў ахвярам вайны.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры.** Мы павінны помніць ахвяр вайны, як і павінны помніць герояў. А іх было шмат. Стойкіх, мужных, адважных. Менавіта такім і быў вядомы партызанскі камандзір Бацька Мінай. Так празвалі Міная Шмырова партызаны заснаванага ім атрада, які быў арганізаваны пасля захопа фашыстамі пасёлка Сураж у 1941 годзе. Не страчваючы надзеі знішчыць Шмырова, фашысты ўзялі ў палон дзяцей камандзіра: Лізу (14 год), Сярожу (10 год), Зіну (7 год), Мішу (3 гады). Дзяцей білі, запугвалі, трымалі ў голадзе і холадзе. Фашысты абяцалі пакінуць дзяцей у жывых. Бацька Мінай хацеў здацца немцам, але ўсё вырашыла запіска старэйшай дачкі Лізы: «Тата, за нас не хвалюйся, нікога не слухай, да немцаў не ідзі. Калі цябе заб'юць, то мы бяссільныя і за цябе не адпомсцім. А калі заб'юць нас, тата, то ты адпомсціш». 14 лютага 1942 года гітлераўцы расстралялі дзяцей, сястру Міная і маці яго жонкі. Запіску Лізы Мінай усю вайну насіў каля сэрца.

**Настаўнік музыкі.** Дзеці, каб глыбей адчуць увесь боль і жах гэтай трагедыі, я прапаную вам паслухаць «Баладу аб чатырох заложніках» ў выкананні ансамбля «Песняры». *(Перад вучнямі ляжыць тэкст твора А. Куляшова «Балада аб чатырох заложніках».)*

<u>Пытанні пасля слухання твора</u>

- ✓ Якое ўражанне зрабіў на вас гэты твор?
- ✓ Аб чым вам расказала музыка?
- ✓ Як вы лічыце, ці трэба нам сёння слухаць такія творы? Чаму?
- ✓ Якімі словамі вы б ахарактарызавалі гэты твор?

**Настаўнік музыкі.** Уладзімір Мулявін, заснавальнік легендарнага калектыву, нарадзіўся ў Свярдлоўску, яго называюць «рускі беларус», таму што ўсё сваё жыццё ён славіў беларускую народную песню, рабіў сучасныя аранжыроўкі – і песні набывалі непаўторнае гучанне. Тэма вайны вельмі значна паўплывала на творчасць песняра. Менавіта Уладзімір Мулявін паклаў «Баладу аб чатырох заложніках» на музыку. Назаўжды застанецца ў памяці слухачоў яго выкананне песень «Хатынь», «Малітва», «Спадчына»,

таму што яны краналі душу кожнага слухача. Уладзімір Мулявін пакінуў гэты свет у 2003 годзе, але яго творчасць назаўжды застанецца бясцэнным скарбам нашай нацыянальнай і культурнай спадчыны.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры.** У часы вайны людзей ратавала вера. Вера ў перамогу, у сваю моц і веліч, і вера ў Бога. Людзі маліліся і прасілі аб тым, каб хутчэй прайшлі жахі вайны і мір зноў панаваў на нашай зямлі. Гавораць, што найбольш магутнай з’яўляецца малітва на месцы, адзначаным Богам. Такое месца ёсць і ў Слонімскім раёне.

**Вучань** *(расказвае пра Жыровіцкі манастыр).* 20 мая 2020 года ўвесь праваслаўны свет адзначыў 550-годдзе цудадзейнай іконы Жыровіцкай Божай Маці, а таксама 500-годдзе з часоў заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра. Згодна з паданнем, у 1470 годзе ікона цудоўным чынам з’явілася мясцовым пастухам сярод галін дзікай грушы. Пасля на гэтым месцы быў пабудаваны драўляны храм у гонар Прасвятой Багародзіцы. На жаль, храм загінуў у час пажару ў 1520 годзе, тады ж прапала і ікона, усе пошукі былі дарэмнымі. Аднак цудоўным чынам ікона пасля з’яўлення Божай Маці была знойдзена на камяні непадалёку. Пасля гэтай падзеі на месцы царквы, якая згарэла, быў пабудаваны каменны храм. Мноства выпрабаванняў выпала на долю гэтага месца, але яно да гэтага часу з’яўляецца адным з важнейшых цэнтраў духоўнага жыцця Беларусі, а ікона знаходзіцца ва Успенскім саборы злева ад Царскіх варот. Выяўленая цудоўным чынам на камяні, велічынёй некалькі сантыметраў, апаленая пажарам, крыху трэснутая ад агню і часу ікона з’яўляецца галоўнай святыняй Жыровіцкага манастыра.

**ІІІ. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры.** Беларуская зямля – багатая зямля. Багата ў нас сваіх традыцый, знакавых месцаў, таленавітых людзей. Наша гісторыя багата імёнамі, датамі, падзеямі, якія мы не забудзем ніколі. Гэта наша спадчына. Гэта наш скарб! Дзеці, а якую спадчыну хацелі б

пакінуць пасля сябе вы? Ці была наша сёняшняя сустрэча карыснай для вас? *(Вучні дзеляцца сваімі ўражаннямі.)*

Завяршаецца мерапрыемства гучаннем Паланеза Агінскага са словамі ў выкананні сучаснага саставу ансамбля «Песняры».

## ЛІТАРАТУРА

1. **Абдуллин, Э. Б.** Теория музыкального образования: учебник для студ. высш. пед. учеб. заведений / Э. Б. Абдуллин, Е. В. Николаева. – М.: Академия, 2004. – 336 с.

2. **Алиев, Ю. Б.** Настольная книга школьного учителя-музыканта / Ю. Б. Алиев. – М.: Владос, 2000. – 336 с.: ноты.